# ЁН ВЫХОЎВАЎ ЛЮБОЎ ДА БЕЛАРУСКАГА СЛОВА

Яшчэ ў час вучобы ў нясвіжскай настаўніцкай семінарыі Мікалай Раманоўскі (Кузьма Чорны) на перапынках або ўвечары на кватэры разыгрываў вясёлыя сцэнкі. І рабіў гэта артыстычна.

Хлопцы прасілі: “Коля, раскажы, як два цімкаўцы сустрэліся на кірмашы”. Мікалай Раманоўскі пачынаў апавядаць. І чуўся выбух смеху.

У семінарыі ён удзельнічаў у драматычным гуртку. У купалаўскай “Паўлінцы” выконваў ролю Пустарэвіча.

Калі Мікалай Карлавіч жыў і працаваў у Цімкавічах, прымаў актыўны ўдзел у пастаноўках і канцэртах. Вялікай папулярнасцю ў 1921—22 гадах карыстаўся спектакль па п’есе Л. Андрэева “Дні нашага жыцця”, у якім адну з галоўных роляў выконваў Раманоўскі.

З вялікай ахвотай ён чытаў са сцэны свае фельетоны, гумарэскі. Не будучы прафесійным чытальнікам, Мікалай Карлавіч інсцэніраваў свае творы вельмі цікава. Гледачы з захапленнем чакалі яго новых фельетонаў і жартаў, якія ён не паўтараў двойчы і ніколі не запісваў.

Першым сцэнічным творам К. Чорнага была сцэна-сатыра “Не пішы чорт ведае як”, надрукаваная ў часопісе “Маладняк” у 1925 годзе. У 1929-ым на старонках часопіса “Узвышша” з’яўляецца частка незакончанай п’есы пад назвай “З драмы” (бытавы малюнак з жыцця беларускай вёскі). Была яшчэ адна нездзейсненая задума — напісаць п’есу “Вызваленне” да 10-ай гадавіны вызвалення Беларусі ад белапольскіх акупантаў.

У 1932 годзе К. Чорны піша п’есу “Лета”. Сам аўтар адчуваў, што яна слабая. І таму на падмосткі тэатра твор не трапіў.

А вось п’еса “Бацькаўшчына” з поспехам прайшла 7 лістапада 1932 года ў тэатры імя Я. Купалы і атрымала шмат водгукаў і станоўчых рэцэнзій у перыядычным друку. Высока ацанілі п’есу ў Маскве, куды тэатр выязджаў на гастролі ў 1933 годзе.

У 1938 годзе напісана аднаактавая п’еса “Базылевіча сям’я”.

У 1940 годзе з’яўляецца п’еса “Ірынка”, прысвечаная жыццю і змаганню працоўных Заходняй Беларусі. Прэм’ера адбылася ў 1941 годзе ў тэатры імя Якуба Коласа. Пазней, пад назвай “У апошнюю ноч”, яна ставілася ў тэатры імя Янкі Купалы, а пасля Вялікай Айчыннай вайны ў Цімкавіцкім народным тэатры.

Паколькі п’есы Кузьмы Чорнага ставіліся на сцэне тэатра імя Янкі Купалы, артысты лічылі яго членам свайго калектыву. Таму, калі ён памёр, труна з целам Кузьмы Чорнага была ўстаноўлена пад дахам тэатра.

А народны артыст рэспублікі Г. Глебаў на пахаванні К. Чорнага сказаў: “Мы асабліва ўшаноўваем памяць аб К. Чорным, бо з яго творчасцю звязаны важнейшыя этапы нашай сцэнічнай дзейнасці. Пастаноўка ў нашым тэатры п’есы “Бацькаўшчына” была падзеяй не толькі вялікага мастацкага значэння для ўсіх нас, для нашага гледача. Работа над гэтай п’есай для калектыву тэатра была школай, выхаваўшай у нас любоў, павагу і беражлівыя адносіны да беларускага слова, яго глыбокага сэнсу, яго мелодыі і прыгажосці”.

*Людміла НІЖЭВІЧ,*
дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Кузьмы Чорнага.